## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. *Барышаў, Г. І.* Беларускі народны тэатр батлейка / Г. І. Барышаў, А. К. Саннікаў. – Мінск : М-ва вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР, 1962. – 179 с.
2. *Барышаў, Г. І.* Беларускі народны тэатр «батлейка» і яго сувязі з рускім «вяртэпам» і польскай «шопкай» / Г. І. Барышаў, А. К. Саннікаў. – Мінск : Акадэмія навук БССР,1963. – 27 с.
3. *Саўчук, Н. М.* Беларуская батлейка / Н. М. Саўчук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 3. – С. 32–38.
4. Социология искусства / отв. ред.: В. С. Жидков [и др.]. – М. : Прогресс-Традиция, 2010. – 496 с.
5. *Шацкий, С. Т.* Педагогические сочинения : в 4 т. / С. Т. Шацкий ; под ред. И. А. Каирова [и др.] ; Акад. пед. наук РСФСР. – М. : Просвещение, 1962–1965. – Т. 1 : Автобиографические работы. Труды дореволюционного периода / сост. Г. Ф. Морозова. – 1962. – 503 с.


УДК 304.44:378.046.4

**В. Б. Хачкова,**

*народны майстар Беларусі, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, педагог-майстар, кіраўнік народнай студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Бусляня» ўстановы адукацыі «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ. ПРАЕКТНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

**Анатацыя.** *Абгрунтоўваецца неабходнасць інтэграцыі культурнага і адукацыйнага працэсаў і апісаны асабісты вопыт педагога-майстра па вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў з выкарыстаннем формы праектнай дзейнасці.*

**Ключавыя словы**: *гісторыка-культурная спадчына, установы дадатковай адукацыі, інтэграцыя, праектная дзейнасць, дэкаратыўна-прыкладная творчасць.*

**O. Khachkova,**
*People's Master of Belarus, member of the Belarusian Union of Masters of folk art, teacher-master, head of the folk studio decorative and applied creativity "Buslyana" of the Educational Institution "National Center of Artistic Creativity of Children and Youth" of the Ministry of Education of the Republic of Belarus, Minsk, Republic of Belarus*

# STUDY OF THE HISTORICAL AND CULTURAL HERITAGE OF BELARUSIAN PEOPLE IN ADDITIONAL EDUCATION INSTITUTIONS. PROJECT ACTIVITY

**Abstract.** *The article presents the justification of the need for the integration of cultural and educational processes, and the personal experience of a master teacher in studying the historical and cultural heritage of Belarusians using the form of project activity.*

**Key words**: *historical and cultural heritage, supplementary education institutions, integration, project activity, decorative and applied creativity.*

Нематэрыяльная культурная спадчына найбольш яскрава ўвасабляе духоўны патэнцыял нацыі, з'яўляецца выражэннем яе светапогляду і менталітэту. Іншымі словамі, гэта жывая культура, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне і прызнаецца яе носьбітамі сваёй спадчынай.

Асобая актуальнасць культурнай пераемнасці заключаецца ў неабходнасці фарміравання адукацыйна-выхаваўчага асяроддзя, якое садзейнічае выкарыстанню кластара культурнай спадчыны беларускага народа і захаванню традыцыйных рамёстваў шляхам адаптацыі іх у сістэме адукацыі.

Далучэнне навучэнцаў да вывучэння, захавання, адраджэння і развіцця традыцыйнай народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці – найважнейшая і найскладаная педагагічная задача.

Адным з рашэнняў гэтай праблемы з'яўляецца рэалізацыя інтэграванага падыходу, які спалучае лепшыя традыцыі народнай культуры і педагагічнай практыкі ва ўмовах устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. У межах інтэграцыі рэсурсаў і намаганняў творчых калектываў устаноў культуры і адукацыі раскрываюцца асаблівыя магчымасці па найбольш глыбокаму вывучэнню, засваенню і развіццю дзецьмі і падлеткамі традыцыйных народных рамёстваў праз далучэнне да рэгіянальнага нацыянальнага мастацтва.

*Мэта* – вывучэнне гісторыі і засваенне культурнай спадчыны шляхам стварэння сістэмы пераемнасці традыцый мастацкіх рамёстваў

(інтэграцыя). Выкарыстанне формы праектнай дзейнасці як сродку вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў на занятках ва ўстановах дадатковай адукацыі.

*Асноўная частка.* У складаны час мы заўсёды звяртаемся да гісторыі, знаходзім моц, дакранаемся да мудрых парадаў продкаў. Кожны чалавек – носьбіт мінулага і сучаснасці, нацыянальнага характару, у большай ступені гэтыя словы адносяцца да майстроў, для якіх занятак рамяством стаў асноўнай справай жыцця. Майстэрства заўсёды шанавалася ў народзе, яго, як каштоўнасць, клапатліва зберагалі з пакалення ў пакаленне.

Кіруючыся гэтым, навучэнцы і педагогі Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі правялі мэтанакіраваную работу па даследаванні рэгіянальных асаблівасцей традыцыйнага мастацтва Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Праца па вывучэнні і рэалізацыі кампетэнцый у выкананні творчых работ адбылася ў форме праекта.

Над праектам працавалі педагогі і вучні двух студый: народная студыя дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Бусляня» і народная студыя фітадызайну «Славянскі вянок» Нацыянальнага цэнтра дзяцей і моладзі.

Асаблівасцю даследча-творчай дзейнасці з’явіўся пошук этнаграфічных матэрыялаў, знаёмства з народным клубам майстроў «Спадчына» Старадарожскага цэнтра рамёстваў (кіраўнік клуба С. С. Змітрук), выкарыстанне ў творчай перапрацоўцы атрыманых матэрыялаў, стварэнне сучаснага адзення і аксесуараў традыцыйных узораў *«рухаўскіх дываноў»*.

Дзякуючы праведзенай экспедыцыйнай рабоце ўдзельнікі даведаліся пра гісторыю *рухаўскіх дываноў* і што *рухаўскія дываны* зроблены майстрыхамі Старадарожчыны ў тэхніцы аплікацыі саломкай з вёскі Рухава. Дываны разглядаліся на пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны 11.12.2019 г. (пратакол № 04-01-02/10). Пастанаўленнем Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 03.01.2020 г. № 1 ім прысвоены статус «нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны» (далей – НКС). Яны маюць назву «Традыцыі вырабу дываноў у тэхніцы аплікацыі саломкай па тканіне ў Старадарожскім раёне Мінскай вобласці».

Адкуль жа пайшла назва *«рухаўскія дываны»*? А пайшло гэта менавіта ад вёскі Рухава, дзе і вырабляюць такія дываны. Удзельнікаў праекта вельмі ўразіла асобая эстэтыка выраблення гэтых дываноў – яны як складнікі народнай душы, народнага характару.

*Гіпотэза,* якую мы вырашылі праверыць і ў чым упэўніцца падчас работы над праектам: як будзе спрыяць творчаму развіццю асобы і

выкарыстанню навыкаў і ўменняў па народнаму дэкаратыўна-прыкладному мастацтву ў асабістай творчасці навучэнцаў вывучэнне розных элементаў народных рамёстваў. Працэс інтэграцыі культуры і адукацыі ў захаванні, папулярызацыі і перадачы культурных традыцый дазволіць фарміраваць творчую актыўнасць і нацыянальную самасвядомасць падрастаючага пакалення.

*Задачы:*

– пазнаёміцца з паняццем «гісторыка-культурная каштоўнасць Рэспублікі Беларусь»;

– рэалізаваць на практыцы такую форму работы па вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны, як праект;

– даследаваць гісторыю, асаблівасці і сакрэты майстэрства па стварэнні дываноў Старадарожскага раёна Мінскай вобласці, аздобленых аплікацыяй саломкі па тканіне;

– пазнаёміцца з тэхналогіямі выкарыстання «рухаўскіх дываноў» у сучасным тэкстылі;

– пашырыць уяўленні аб магчымасцях працы з рознымі відамі народных рамёстваў;

– рэалізаваць на практыцы веды і навыкі па народнай традыцыйнай культуры;

– выхоўваць матывацыю да імкнення далучацца да агульначалавечых і нацыянальных духоўных каштоўнасцей, цікавасць да беларускай народнай культуры і беларускай народнай творчасці.

Інавацыйны характар праектнай дзейнасці навучэнцаў складаюць пошук, даследаванні, спалучэнне народнага мастацтва і сучаснай творчасці з выкарыстаннем розных відаў народных рамёстваў.

*Вынікі* прадстаўляюцца на абмеркаванне ў студыях у выглядзе творчых работ, выкананых калектыўна, уключаючых гістарычную спраўку і ўласныя творчыя распрацоўкі ў эскізах і вырабах. Удзельнікі праекта дзеляцца думкамі, адказваюць на пастаўленыя пытанні. Педагогі, кіраўнікі праекта, ацэньваюць актыўнасць навучэнцаў, крэатыўнасць, якасць выканання работ, патэнцыял і перспектыву працягу работы. Навучэнцы фарміруюць вынікі аб тым, што праблемы пераемнасці традыцый мастацкіх рамёстваў з'яўляюцца актуальнымі і, каб захаваць і ўбачыць іх у сучасных умовах, патрэбна ведаць народную творчасць, даследаваць і творча выкарыстоўваць у жыцці.

У ходзе работы над праектам быў зняты відэафільм.

Прадуктам праекта стала калекцыя сучаснага адзення (сукенак і аксесуараў), якая дэманструе вынік выкарыстання традыцыйных узораў з «рухаўскіх дываноў» у сучаснай дзіцячай творчасці. У цяперашні час калекцыя дэманструецца на Рэспубліканскай выстаўцы-конкурсе мастац-

кіх праектаў «Спрадвечнае заўтра», калектываў, якія маюць званне «народны», «узорны», «заслужаны».

*Удзельнікі праекта адказалі на наступныя пытанні:*

1. Што прывабіла мяне да ўдзелу ў праекце?
2. Аб чым новым даведалася? Чаму новаму навучылася?
3. Што для сябе выкарыстала б у сваёй творчасці? Ці ўдзельнічала б яшчэ ў падобным праекце?
4. Што больш за ўсё спадабалася ў працэсе працы над праектам? З якімі ўражаннямі была звязана мая работа па засваенні рамяства?

Хачкова Кацярына,14 год (народная студыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Бусляня» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі): «Мне было цікава даведацца аб беларускай народнай творчасці. Я, зразумела, больш даведалася пра нематэрыяльныя каштоўнаці і “рухаўскія дываны”. Пазнаёмілася з тэхналогіяй аплікацыі саломкай па дрэве на прыкладзе драўляных сумак і паспрабавала набойку па тканіне. Я думаю, што выкарыстала б аплікацыю з саломкі для невялічкіх упрыгожванняў. Я атрымала цікавы і пазнавальны вопыт даследчай работы. Было шмат новай і цікавай інфармацыі. Цяпер я ведаю, што такое “нематэрыяльныя культурныя каштоўнасці”, што такое “рухаўскія дываны” і наколькі важна іх зберагаць. Магу зрабіць прыгожыя творы для сабе, ці на падарункі сяброўкам».

Міськевіч Яраслава, 7 год (народная студыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Бусляня» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі): «Я даведалася аб рамёствах, якімі займаліся даўно, пазнаёмілася з аплікацыяй саломкай, навучылася маляваць лосіка і паспрабавала зрабіць малюнак праз трафарэт.

Мне вельмі падабаецца торбачка, якую я зрабіла сваімі рукамі. Буду далей знаёміцца з гісторыяй мастацтва, наведваць студыю і пераймаць уменні ў майстроў народнай творчасці, ствараць цікавыя рэчы і радавацца ім».

Таптунова Варвара, 14 год (народная студыя фітадызайну «Славянскі вянок» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі): «Новая форма занятия. Возможность проявить себя и поучаствовать в необычном проекте. Мне понравилась поездка в Стародорожский район – родину “руховских ковров”. Возникло желание создавать современные изделия с сюжетами “руховских ковров”. Использовать белорусские традиционные ремесла в выполнении самостоятельно задуманной и разработанной вещи. Получила новые впечатления, освоение традиционных технологий – умение обобщать и использовать экспедиционный материал в современных изделиях».

Леановіч Ксенія, 14 год (народная студыя фітадызайну «Славянскі вянок» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі): «Для меня проект очень познавательный. Я знала, что есть расписные ковры "маляванкі", а что ковры еще украшали аппликацией из соломки, узнала только в экспедиции. Попробовала ткать на ткацком станке. С удивлением узнала, что "руховские ковры" из маленького местечка Беларуси были известны на весь Советский Союз. Работая в проекте, я осознала себя частью белорусской культуры».

Кашнікава Марыя, 14 год (народная студыя фітадызайну «Славянскі вянок» Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі): «Пашырыла свае веды аб народнай культуры: што такое "рухаўскія дываны", як яны рабіліся і выкарыстоўваліся. З захапленнем выканала сучасныя рэчы ў стылі "рухаўскіх дываноў" з выкарыстаннем новай для мяне тэхнікі аплікацыі фетрам. Мне хацелася б зрабіць для сябе такі дыван. Мне вельмі падабаецца стыль фолк. Я буду выкарыстоўваць рухаўскія ўзоры ў сваіх будучых распрацоўках і абменьвацца творчымі ідэямі з сяброўкамі і малодшымі. Мастацтва аплікацыі на прыкладзе рухаўскіх узораў – цікавая і захапляльная праца»!

*Заключэнне.* Выкарыстанне праекта як формы вывучэння культурнай спадчыны – гэта шлях да культурнага самаразвіцця асобы праз усведамленне асабістых патрабаванняў, праз творчую самарэалізацыю ў прадметнай вобласці. У працэсе праектнай дзейнасці навучэнцы атрымоўваюць поўнае і глыбокае задавальненне ад зробленага, развіваецца іх творчая актыўнасць, вызначаецца сацыяльная пазіцыя. Пры гэтым пазнаецца культура роднага краю, самабытнасць беларускага народа, выхоўваюцца патрыятычныя пачуцці.

Стварэнне сістэмы пераемнасці – даволі складаны працэс, які ўключае інтэграваныя працэсы яднання культуры і адукацыі, патрабуе сур'ёзнага пераасэнсавання традыцыйных узораў і граматнага падыходу да адаптацыі сінтэзу ў сучаснае мастацтва. Але ж можна станоўча адзначыць сумесныя праекты – гэта пазнавальны і безумоўна карысны вопыт па вырашэнні пытанняў пераемнасці і зберажэння традыцыйнай народнай культуры.

Такім чынам, асваенне старажытных рамёстваў з мэтай іх адраджэння і захавання ў сучасным свеце, развіццё народнай культуры з'яўляюцца асновай выхавання і зберажэння духоўных каштоўнасцей беларускага народа.















Творчая лабараторыя, удзел у майстар-класе па вырабе торбачкі ў тэхніцы аплікацыі саломкай з выкарыстаннем элемента з рухаўскага дывана 04.01.2022 г., Старадарожскі цэнтр рамёстваў

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Бессарабова, И. С.* Проблема интеграции образования и культуры в современной отечественной педагогике [Электронный ресурс] / И. С. Бессарабова // Образование и культура. – 2006. – № 1. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/problema-integratsii-obrazovaniya-i-kultury-v-sovremennoy-otechestvennoy-pedagogike. – Дата доступа: 4.01.2022.

2. *Гамзатова, Г. К.* Исторический и теоретический анализ сложившегося опыта традиционной народной педагогики в развитии художественных и творческих способностей учащихся / Г. К. Гамзатова // Этнокультурная деятельность в современных образовательных организациях и учреждениях культуры: опыт, проблемы, перспективы : материалы Междунар. науч.-практ. конф. (Москва, 25 марта 2017 г.) / редкол.: Т. И. Бакланова [и др.]. – Чебоксары, 2017. – С. 103–107.

3. Жывая спадчына Беларусі: інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны [Электронны рэсурс] // М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Рэжым доступу: http://livingheritage.by/nks/7. – Дата доступу: 4.01.2022.

4. Кодекс Республики Беларусь об образовании от 13 января 2011 г. с изменениями, внесенными Законом Республики Беларусь от 14 января 2022 г. № 154-З. [Электронный ресурс] // М-во образования Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://edu.gov.by/sistema-obrazovaniya/doshkolnoe-brazovanie/normativnye-pravovye-akty/kodeksy-respubliki-belarus/. – Дата доступа: 4.01.2022.

5. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] // Прававы сайт Pravo.by. – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413. – Дата доступу: 4.01.2022.

6. *Сухая, Н.* Народнае мастацтва і традыцыйныя мастацкія рамёствы. Вопыт актуалізацыі ў сучасным грамадстве / Н. Сухая // Міжнар. навук.-практ. канф. у рамках III абласнога свята народных мастацкіх рамёстваў «Слуцкія паясы», г. Слуцк, Мінская вобласць, Рэспубліка Беларусь, 22–23 верасня 2017 г.) / уклад. Наталля Сухая. – Мінск, 2017. – 59 с. – (Гісторыя традыцыйнай набойкі па тканіне на Беларусі).

7. Теория и практика декоративно-прикладного искусства: учеб. программа учреждения высшего образования по учебной дисциплине второй ступени высшего образования (магистратура) для специальности 1-08 80 02 Теория и методика обучения и воспитания (изобразительное искусство и черчение) / Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка. – Минск, 2018.